**Я.Д.Грыгаровіч**, *прафесар*

# СТАНДАРТЫ КУЛЬТУРАЛАГІЧНАЙ АДУКАЦЫІ: ЗНАЧЭННЕ, МЭТА, СЭНС

Аналіз многавяковай гісторыі развіцця чалавечай цывілізацыі прыводзіць да несуцяшальных вывадаў аб няздольнасці шматлікіх пакаленняў пабудаваць разумнае грамадства, заснаванае на прынцыпах дабра, справядлівасці, любові чалавека да чалавека. Вялікія дасягненні ў навукова-тэхнічнай сферы, пакарэнне прыроды і вытворчыя дасягненні не зрабілі чалавека ні шчаслівейшым, ні справядлівейшым, ні дабрэйшым.

Напрыканцы другога тысячагоддзя аднабаковаму рацыяналізму, гвалтоўнаму пакарэнню прыроды, усеагульнай неабдуманай індустрыялізацыі, атручванню навакольнага асяроддзя прадуктамі гэтак званай тэхнічнай рэвалюцыі, бяздушным адносінам да канкрэтнай чалавечай істоты на карысць росквіту грамадства процістаўляецца вучэнне аб чалавеку, яго свабодзе і адказнасці, яго асабістай прасторы і духоўнасці, значнасці і самакаштоўнасці асобы. Антрапалагічны рэнесанс прыводзіць да паглыблення і пашырэння сфер уплыву такіх навук аб чалавеку, як філасофія, культуралогія, рэлігійная антрапалогія, і актыўнага з'яўлення новых: сацыяльнай, псіхааналітычнай, палітычнай, эканамічнай антрапалогіі, іншых даволі экзатычных для нашага слыху навук (Гранин Ю., Разумов А. Антропологический ренессанс. Что дальше? // Высшее образование в России. — 1998. — №1).

Не ацэньваючы якасці антрапалагічных даследаванняў і публікацый, трэба адзначыць станоўча тэндэнцыі іх узнікнення, бо ўсякая новая гуманітарная навука не ў арыфметычнай прагрэсіі, але ж павялічвае колькасць ведаў аб чалавеку, аб розных баках яго існавання і дзейнасці і, што самае важнае, сцвярджае безумоўны прыярытэт чалавека, асобы над штучнымі сацыяльнымі паняццямі прымату грамадства, дзяржавы і іншымі палітычнымі эквілібрамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Значна мяняецца ў ракурсе антрапалагічных навук і погляд на вынікі чалавечай дзейнасці, на ролю і мэты тэхнакратычнай палітыкі чалавека ў XX стагоддзі, на месца асобы ў структуры матэрыяльнай і духоўнай вытворчасці.

Настаў час, калі штучная мяжа паміж прыродазнаўчымі і гуманітарнымі ведамі, абавязаная сваім узнікненнем неакантыянству і іншым філасофскім плыням пачатку XX стагоддзя, паступова разбураецца, і ўсе цяжкасці, якія здаваліся ў пачатку стагоддзя непераадольнымі, сёння паступова знікаюць. Больш таго, гэтае проціпастаўленне больш тэарэтычнае, чым існуючае ў практыцы, і бытавала яно хутчэй на старонках навуковых і папулярных выданняў, чым у рэальным жыцці.

Сёння гуманітарныя навукі з поспехам карыстаюцца інструментарыем прыродазнаўчых даследаванняў, выкарыстоўваюць іх дасягненні і атрыманыя вынікі, а дакладныя навукі грунтуюцца на дасягненнях гуманітарных, чалавеказнаўчых, антрапалагічных навук (Ильин В.В., Панарин А.С., Бадовский Д.В. Политическая антропология. — М., 1985; Леви-Стросс К. Структурная антропология. — М.,1983).

Зняцце ўмоўных абмежаванняў паміж асобнымі галінамі навукі пацягнула за сабой усведамленне неабходнасці "ачалавечвання", гуманітарызацыі ўсёй сістэмы адукацыі, перагляду аб'ёмаў вывучэння асобных навук, суадносін дакладных і гуманітарных дысцыплін.

Перабудовачныя працэсы ў постсавецкіх краінах, зняцце "жалезнай" заслоны запатрабавалі суаднясення адукацыі зноў узніклых незалежных краін з еўрапейскай сістэмай падрыхтоўкі спецыялістаў, стварэння блізкай, а ў наступным стагоддзі і адзінай інфармацыйнай прасторы, тэхналагічных і камунікацыйных сродкаў узаемадзеяння на кантынентах.

Уніфікацыя сусветных сістэм адукацыі запатрабавала дакладнага вызначэння сумы абавязковых ведаў, аб'ёму ўменняў і навыкаў, якія дазвалялі б у дастатковай ступені

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

поўна перадаць маладому чалавеку дасягненні чалавечай цывілізацыі, падрыхтаваць яго да жыцця ў сучасным сацыяльным асяроддзі, стварыць зыходную платформу для выканання прафесійных абавязкаў і пастаяннага ўдасканалення, самаадукацыі і прафесійнага росту.

Вызначэнне аптымальнага зместу адукацыі, суаднясенне яго з патрэбамі жыцця і вытворчасці, ураўнаважванне з аб'ёмам ведаў у навучальных установах розных тыпаў, розных накірунках навукі, гарманізацыя яго з аб'ёмам неабходных ведаў у падобных навучальных установах іншых краін выклікалі неабходнасць стварэння стандартаў адукацыі. У шырокім сэнсе стандарт — гэта дакумент, які вызначае абавязковы мінімальны ўзровень патрабаванняў да зместу, працэсу і вынікаў адукацыйнай дзейнасці, неабходны для станоўчага выканання выпускніком вышэйшай навучальнай установы прафесійных і сацыяльных функцый.

Сістэма стандартаў вышэйшай адукацыі дазволіць стварыць механізм навуковага кіраўніцтва адукацыяй, кантролю за якасцю адукацыйных кампанентаў, упарадкаваць узаемаадносіны ў галіне падрыхтоўкі прафесійных кадраў, спрыяць іх рэгуляванню, удасканаленню.

Увядзенне агульных стандартаў адукацыі дазволіць забяспечыць магчымасць "стыкоўкі" розных галін адукацыі, розных яе ўзроўняў, зняўшы існуючыя ў сучаснай сістэме паўторы, таўталогіі, несупадзенні, а таксама дазволіць студэнтам ажыццяўляць мяккі пераход да наступнага ўзроўню адукацыі: школа — сярэднеспецыяльная ўстанова — універсітэт — бакалаўрыят — магістратура — аспірантура — у залежнасці ад здольнасцей, пазнавальных магчымасцей і патрэб канкрэтнай асобы.

І яшчэ адзін важнейшы аспект значэння стандартаў адукацыі — магчымасць гарманічнага ўваходжання беларускай сістэмы адукацыі ў агульнаеўрапейскую і вяртання беларускага студэнта ў еўрапейскую

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адукацыйную прастору. Гарманізацыя адукацыйнай прасторы Беларусі з сістэмамі адукацый іншых дзяржаў выступае адной з галоўных умоў уваходжання нашай краіны ў еўрапейскія інфармацыйныя патокі, у сацыяльна-эканамічную структуру, у сусветную віртуальную рэальнасць, што паспрыяе ў сваю чаргу павышэнню якасці прафесійнай адукацыі і паспяховаму рэфармаванню агульнай сістэмы адукацыі ў нашай краіне.

**С.В.Аўдзей,** *дацэнт*

## КОМПЛЕКСНЫ ПАДЫХОД ДА СТАНДАРТЫЗАЦЫІ СТРУКТУРЫ І ЗМЕСТУ АДУКАЦЫІ САЦЫЯЛЬНЫХ ПЕДАГОГАЎ САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ СФЕРЫ

Сацыяльны педагог — спецыяліст, які займаецца педагагічнай дзейнасцю ў соцыуме. Спецыфіка працы такога работніка абумоўлена асаблівасцямі развіцця грамадства, вынікае з яго асноўных праблем і сацыяльнай палітыкі ў цэлым.

Сярод праблем, якія ў першую чаргу патрабуюць сацыяльнай, сацыяльна-педагагічнай дапамогі, трэба адзначыць зніжэнне нараджальнасці, а таксама нараджэнне дзяцей, якім з першых дзён жыцця патрэбен дадатковы догляд. Актуальнай для дзяржавы праблемай з'яўляецца пагоршаны стан здароўя дзяцей, моладзі. Толькі за год у рэспубліцы робяць да 450 аперацый дзецям з ракам шчытападобнай залозы. Павялічылася колькасць дзяцей з псіхічнымі адхіленнямі. Назіраецца павелічэнне колькасці дзяўчынак, якія маюць венерычныя захворванні (узроставая мяжа знізілася да 13-ці гадоў). Такім чынам, праз 10–12 гадоў можам мець яшчэ менш паўнацэнных, здаровых дзяцей. А сям'я без дзіцяці ці з хворымі дзецьмі — гэта ў першую чаргу сацыяльна-педагагічная праблема. Трэба адзначыць, што з'явілася новая сацыяльная праблема — забойства



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ